*УДК 398.332.2(476.2-37Рэчыца)*

**М. А. Стаўская**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ЛЕТНІЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ ЖЫХАРОЎ РЭЧЫЦКАГА ПАЛЕССЯ

*У артыкуле на багатым аўтэнтычным фальклорна-этнаграічным матэрыяле, запісаным падчас палявых экспедыцый на тэрыторыі Рэчыцкага Палесся і змешчаным у зборніку “Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна” [1], разгледжаны рэгіянальна-лакальныя асаблівасці купальскай і жніўнай абраднасці.*

Летні цыкл земляробчага календара, які найперш уключае купальскія і жніўныя абрады і песні, дэманструе глыбокую сувязь чалавека з прыродай. У ім кожнае абрадавае дзеянне напоўнена магіяй і архаікай народных вераванняў. У летнія месяцы, калі зямля дорыць свае найбагацейшыя плады, людзі адзначаюць святы, што ўвасабляюць пэўныя пераходныя моманты сезона, звязаныя з Купаллем і яго магічнымі ачышчальнымі агнямі, жнівом як кульмінацыяй плённай працы, дажынкамі як сімвалізацыяй падзякі зямлі за багаты ўраджай.

Вядома, што летні каляндарна-абрадавы фальклор прадстаўлены найперш святам Івана Купалы, якое адзначаецца з 6 на 7 ліпеня. У гэтую магічную ноч на ўзвышшах і каля рачных берагоў запальвалі вогнішчы, вакол якіх вадзілі карагоды і скакалі праз агонь – як у адзіночку, так і парамі. Паводле сведчанняў жыхароў, кастры павінны былі быць высокімі, што магло паспрыяць ураджайнасці зерневых культур: “*Вельмі важнымі ў Купаллі былі кастры. Яны былі высокімі, каб жыта было высокае, а ўраджай багатым. Іх усягда запалівалі на ўзгорках. Але мы дак раскладывалі на беразе нашага возера. Кастры заўсёды трэба было пераскокваць”* (в. Гірава) [1, с. 144–145]. У некаторых вёсках, калі не раскладвалі касцёр на Купалле, то было прынята, каб абавязкова ў хатах гарэлі лямпы: “*На Купалу раней кастроў не палілі. Усе дамы толькі павінны былі свяціцца, лампы павінны былі абавязкова гарэць. Гэта ўжо пазней пачалі ў Вятхіні кастры паліць”* (в. Вятхінь) [1, с. 142].

Зыходзячы з успамінаў жыхароў гэтай вёскі, запальванне кастра на Купалле было звязана з ураджайнасцю, засцярогай ад хвароб, наладжваннем шлюбных пар: *“Хлопцы калёсы сцягвалі ў кучу, хвораст, нават хаты палілі пустыя. <...> Каля кастра карагоды вадзілі, спявалі*

*песні, у «Чуні» гулялі, у «Гарэпню», загадкі загадвалі, потым праз агонь прыгалі. Купала святкуецца, каб добры ўраджай быў, каб людзі не хварэлі, каб пажадаць усім хлебаробам добрай сілы, каб дзеўкі пасля ўраджаю замуж выходзілі"* (в. Вятхінь) [1, с. 142].

Дзяўчаты плялі вянкі і варажылі, пускаючы іх па вадзе, а напярэдадні зраніцы збіралі лекавыя травы: "*Плялі вянкі з васількоў, кідалі ў рэчку і загадвалі на сябе і на жаніха: еслі ў вадзе сойдуцца гэтыя вяночкі, то будзеш разам у пары, а еслі не то не будзеш"* (в. Азершчына) [1, с. 143]. Па-рознаму ў мясцовых традыцыях тлумачылі *семантыку варожбаў: "Збіраліся маладыя хлопцы, прыгалі праз кастры, а дзяўчаты плялі вянкі і кідалі іх у раку, чый паплыве ўперадзе, значыць, хутка выйдзе замуж, чый патоне, значыць, ніколі дзяўчына не выйдзе замуж. А чый паплыве назад – дзяўчына доўга будзе сядзець у дзеўках"* (в. Красная Дуброва) [1, с. 143].

У сістэме купальскай абраднасці важным загадкавым кампанентам былі пошукі папараці-кветкі як сімвала шчасця і ўдачы: "*Ніколі мы не варажылі а папарæць-кветку шукалі заўсёды. Не было ў нас такога свята, можа таму, што рэчкі не было нідзе побач, толькі копанкі невялічкія*" (в. Дуброва) [1, с. 145]; "*Шчэ на Купалу ў дванаццаць часоў усе дзеўкі і хлопцы ішлі ў лес. Там шукалі папараць кветку, казалі, што той, хто знойдзе яе, усягда будзе здаровы, багаты і шчаслівы*" (в. Ровенская Слабада) [1, с. 145]; "*Затым ішлі ў лес і шукалі сапраўдную папараць-кветку. І лічылі, хто яе знойдзе – будзе разумець мову птушак і звяроў і будзе самы шчаслівы на зямлі*" (г. Рэчыца) [1, с. 146].

Завяршалася свята на досвітку: удзельнікі сустракалі ўзыход сонца і купаліся ў рачных або азёрных водах: "*Вот як мы ўсягда Купалле спраўлялі каля возера, то купаліся. Купаліся ўсе: і дзяўчаты, і хлопцы. Таму што шчыталі, што, хто пакупаецца ў ету ноч, той будзе здаровым і стане красівейшым. Мы дак, дзеўкі, стараліcь як мага больш дзяржаць косы ў вадзе*" (в. Гірава) [1, с. 144].

Паводле народных вераванняў, менавіта ў купальскую ноч назіралася актывізацыя шкаданоснай дзейнасці ведзьмы. Гэтыя істоты, паводле павер'яў, маглі ладзіць свае таемныя зборы і шкодзіць людзям або іх гаспадарцы: "*Ад ведзьмаў абкладывалі крапівой калодзежы, вокны, дзверы. Крапіва бараніла ад злых духаў, сіл і чар*" (в. Гірава) [1, с. 144]; "*У гэтую ноч заўсёды весяліліся ведзьмы. <…> Гэты агонь лічыўся ачышчальным, і нячыстая сіла не магла падабрацца туды. А тым, хто заставаўся дома, ведзьмы і дамавікі рабілі шкоды*" (г. Рэчыца) [1, с. 145].

Засяродзім увагу на характарыстыцы жніўнай абраднасці, у структуры якой вылучаюцца зажынкі, уласна жніво і дажынкі. Варта адзначыць, што працэс жніва быў напоўнены магічным сэнсам,

пачынаючы ад дзеянняў, звязаных з зажынаннем першых каласоў, і завяршаючы рытуаламі, звязанымі з апошнімі каласамі. Жніво мела дакладны парадак дзеянняў, кожнае з якіх суправаджалася пэўнымі абрадамі, вызначалася цікавай сімволікай і адрознівалася верай у сакральны сэнс рытуалаў.

Звычайна жніво пачыналася зажынкамі, падчас якіх адбываўся рытуал зажынання першых каласоў, якія лічыліся магічнымі: "*На жніво жалі жыта. На каторы год зажне першай жыта жэншчына маладая, чыстая – то калі будуць жаць і парэжаш палец ці што другое, не будзе гнаіцца, не будзе балець. А калі першай зажне якая-небудзь няўдалая жанчына ці бальная, усё жніво будуць то нарывы, то раны. Потым тую жанчыну клялі*" (в. Будка) [1, с. 146]. Як правіла, для выканання рытуала зажынання першых каласоў выбіралі жанчыну, шчаслівую ў сямейным жыцці, абавязкова сталага ўзросту: "*Перад пачаткам жніва ў поле адпраўляюць старэйшага, каб паглядзеў ураджай, ці можна жаць, ці не. Калі ўраджай паспеў, то першымі ішлі зажынаць старэйшыя жанчыны. Яны ішлі з хлебам і з салам пасвяцоным*" (в. Ліскі) [1, с. 147]. Першы нажаты сноп прыносілі дахаты і ставілі на покуці: "*Як сажнуць першы сноп, яго нясуць дадому і стаўляюць на кут. Спяваюць песні*" (в. Каравацічы) [1, с. 148].

Дажынкі – абрадавае свята, якое сімвалізавала завяршэнне цяжкай працы падчас самога жніва: "*Тады дажынкі. Зноў сабіраемся ў каробкі. Набіраем тады ўжэ і хлэба, і яды. Тады мужыкі стыя прывозяць на вазах, а мы ж на палянках жалі. Кладуць тры снапы на воз жыта. І тут каля ваза садзяцца, і тутака і дажынкі святкуем. У нас бараду здымалі. Красныя ніткі бярэш, тры каласы ўжэ, зжала паласу жыта ўжэ, звязвалі етыя тры каласы краснаю ніткаю і кругом іх абжынаеш, а яны, каласы, астаюцца: «Жала, жала, буйнае жыта, // Прыйшла родная маці, // Сярпа атабрала // І дажала буйнае жыта*»" (в. Красная Дуброва) [1, с. 149].

Жніўныя песні, якімі суправаджалася цяжкая праца, – важная частка традыцыйнага святкавання жніва. Яны напаўнялі працоўныя дні своеасаблівым жыццёвым рытмам, узмацнялі калектыўны дух і адлюстроўвалі глыбокую сувязь чалавека з зямлёй: "*Ой, у полі дажыначкі, // А ў доме радзіначкі, // Нарадзіла маці сына, // Беленькага лебядзіна, // Нарадзіла маці дачку, // Беленькаю лебёдачку. // Нарадзіла, крэпка ўснула, // Мы будзілі, не ўзбудзілі. // – Ціха, дзеткі, вы не плачце, // Зрубім хату мы новую, // Возьмем жонку маладую. // Згары, хатка, ты, новая, // Памры, матка маладая, // Умры, матка маладая, // Устань, наша, родненькая!"* (в. Азершчына) [1, с. 155].

Такім чынам, летні цыкл традыцыйных святкаванняў – гэта не проста паслядоўнасць пэўных абрадавых дзеянняў, а сапраўдная жывая

тканіна народнай культуры, дзе гарманічна пераплятаюцца старажытныя народныя вераванні. Прааналізаваныя матэрыялы па купальскай і жніўнай абраднасці Рэчыцкага Палесся сведчаць пра адметную іх мясцовую спецыфіку. Звесткі пра Купалле і жніво і сёння ўстойліва захоўваюцца ў народнай памяці, пацвярджаючы іх арганічную сувязь з прыродай, продкамі, раскрываючы глыбінную сутнасць нацыянальнай культуры.

## Спіс літаратуры


1 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна. Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя артыкулы, рэдагаванне І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. – Мінск : ЛМФ «Нёман», 2002. – 384 с.